# АРНАМЕНТАЛЬНАЕ НАТХНЕННЕ

**У Мінску на будынку па вуліцы Рабкораўская, 15 з'явілася незвычайнае па-памерах графіці, аўтарам якога з'яўляецца брытанскі мастак. 28-гадовы Гвідо ван Хельтэн (на фота) прыехаў у беларускую сталіцу ў межах фестывалю манументальнага мастацкага роспісу Urban Myths і пакінуў на сцяне аднаго з інтэрнатаў Універсітэта культуры і мастацтва сваю працу — вобраз беларускі. Мастак паведаміў, што яго захапіў вобраз сучаснай дзяўчыны, на якой пад вопраткай была надзета аўтэнтычная беларуская вышыванка з арнаментам. Свой твор ён ствараў на працягу 10 дзён, але перад пачаткам працы вядомы ў свеце вулічны мастак пазнаёміўся з народнай культурай нашай краіны — пабываў у музеі народнай архітэктуры і побыту, паглядзеў шэраг фотаальбомаў, каб увасобіць у малюнку побач з сучаснымі тэндэнцыямі і старажытныя народныя традыцыі. Брытанец гаворыць, што выразна адчуў, наколькі важныя для беларусаў нацыянальныя сімвалы.**





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ